

Дзятлаўчане ўдзельнічаюць у планавых вайсковых зборах

Галоўнае | Грамадства

04.04.2023 administrator 3021

Наш раён прымае ўдзел у мерапрыемствах па праверцы баявой гатоўнасці аднаго са злучэнняў Заходняга аператыўнага камандавання.

Былыя ваеннаслужачыя, радавыя салдаты і сяржанты 4 красавіка прыбылі ў пункт папярэдняга збору ваеннаабавязаных у сярэднюю школу № 1 горада Дзятлава для рэгістрацыі, праходжання інструктажу і адпраўкі ў вайсковую часць. Згодна з патрабаваннямі “Закона аб мабілізацыйнай падрыхтоўцы і мабілізацыі” іх суправаджалі кіраўнікі сельскіх саветаў, у якіх яны жывуць.




ЛЮДАЕМ ЗАКОНЫ ДОРОП
SPORT
KETTLER




ВРАЧ
ПУНКТА


ОТДЕЛЕНИЕ
РЕЗЕРВА




GUCCI



Пра тое, як праходзяць планавыя мерапрыемствы, расказаў ваенны камісар Дзятлаўскага раёна падпалкоўнік Генадзь Суравец:

– У адпаведнасці з распараджэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праводзіцца комплексная праверка Узброеных Сіл. З красавіка мы атрымалі распараджэнне на прызыў-пастаўку мабілізацыйных рэсурсаў у вайсковыя часці Заходняга аператыўнага камандавання. Ваенным камісарыятам раёна было праведзена апавяшчэнне ваеннаабавязаных і збор у вызначаны тэрмін. Прызыў вядзецца з улікам атрыманых імі ўліковых спецыяльнасцяў, па якіх яны праходзілі тэрміновую службу. Дадзеныя мерапрыемствы планавыя, яны прадоўжацца не больш за 35 сутак. Па заканчэнні збораў усе ваеннаабавязаныя прыбудуць да месца жыхарства і прадоўжаць выконваць свае грамадзянскія абавязкі.

У ліку тых, хто адпраўляецца ў Слонім, работнік Дзятлаўскага філіяла ААТ “Молочный Мир” Дзмітрый Нічыпаровіч. Ён расказаў, што чакае ад збораў:

– Працую на сыраробным заводзе вадзіцелем, у армію прызываюся па гэтай жа спецыяльнасці. Спадзяюся, час, які правяду на зборах, пройдзе хутка, паспяхова і з карысцю: успомню навыкі, атрыманыя ў час тэрміновай службы. Лічу, што служба Радзіме – свяшчэнны абавязак кожнага паўналетняга беларуса. Дома мяне будзе чакаць любімая сям’я – жонка і двое сыноў. Хачу, каб яны ганарыліся сваім татам і сталі сапраўднымі абаронцамі Айчыны.

Разам з мужам на пункт папярэдняга збору прыбыла Анастасія Браніцкая, якая суправаджае групу прызыўнікоў як інспектар Казлоўшчынскага сельсавета. Яна падзялілася сваімі эмоцыямі:

– Адчуванне невялікага суму, што развітваюся з любімым чалавекам больш чым на месяц. Разам з тым гонар за тое, што нашы мужчыны будуць выконваць ваенны абавязак – стаяць на варце нашага міру і спакою. Моцных хваляванняў няма, бо напэўна ведаю: усе ваеннаабавязаныя будуць праходзіць службу на тэрыторыі нашай краіны.

– Пакуль мы служым, нашы блізкія могуць спаць спакойна, – запэўніваюць дзятлаўчане Аляксандр Пузач і Андрэй Жэгала, якія праходзяць афармленне на пункце прызыву.

Вайсковыя зборы – не новае для іх мерапрыемства, удзельнічалі ў іх некалькі гадоў таму. Як адзначаюць маладыя людзі, настрой на службу станоўчы і канструктыўны. Месяц праляціць хутка, і яны вернуцца на Дзятлаўшчыну да сваіх сем’яў.

– Практычна ў кожнага з нас тут ёсць любімыя жонкі і дзеці, якія будуць чакаць, сумаваць, перажываць. Аднак ёсць і адна матуля для ўсіх нас – наша Айчына. І калі яна паклікала на службу сваіх верных сыноў, ніхто не мае права адмовіць, – заўважыў Андрэй Жэгала.

Наталля АВЯРЧУК

Подписывайтесь на телеграм-канал «Дятлово ОНЛАЙН» по короткой ссылке @gazeta_peramoga



ЧИТАЙТЕ ТАКЖЕ:

Рэспубліканская патрыятычная акцыя “Памяць сэрца”

стартавала на Дзятлаўшчыне (+відэа)

13.12.2020

Новоельня – здоровый поселок

01.03.2024

«Сделано все для обеспечения объективной оценки знаний учащихся». Начальник главного управления образования облисполкома Руслан Абрамчик – о проведении первого ЦЭ в регионе

12.05.2023

МЫ В СОЦИАЛЬНЫХ СЕТЯХ

ЛЕНТА НОВОСТЕЙ



РИКЗ: изменить предмет ЦЭ после окончания регистрации нельзя

17.04.2024 Комментарии отключены



У добрых спраў ёсць адрасы

17.04.2024 Комментарии отключены



Па тэме з аналітыкай. Як павысіць даход у пенсійным узросце?

17.04.2024 Комментарии отключены



Навіны бібліятэкі. Вясёлы свет дзіцячых кніг Валерыя Квілорыі

17.04.2024 Комментарии отключены



Александр Лукашенко: открытый диалог и взаимовыгодное сотрудничество между Минском и Дамаском будут углубляться

17.04.2024 Комментарии отключены



Около 500 нарушений охраны труда выявлено профсоюзами гродненщины с начала посевной кампании

17.04.2024 Комментарии отключены



Влияние энергетических напитков на здоровье

17.04.2024 Комментарии отключены



10 000 шагов это полезно

17.04.2024 Комментарии отключены

ПОСЛЕДНЕЕ | ПОПУЛЯРНОЕ | ОБСУЖДАЕМОЕ



РИКЗ: изменить предмет ЦЭ после окончания регистрации нельзя

17.04.2024 Комментарии отключены



У добрых спраў ёсць адрасы

17.04.2024 Комментарии отключены



Па тэме з аналітыкай. Як павысіць даход у пенсійным узросце?

17.04.2024 Комментарии отключены



Навіны бібліятэкі. Вясёлы свет дзіцячых кніг Валерыя Квілорыі

17.04.2024 Комментарии отключены



Александр Лукашенко: открытый диалог и взаимовыгодное сотрудничество между Минском и Дамаском будут углубляться

17.04.2024 Комментарии отключены



Около 500 нарушений охраны труда выявлено профсоюзами гродненщины с начала посевной кампании

17.04.2024 Комментарии отключены



Влияние энергетических напитков на здоровье

17.04.2024 Комментарии отключены



10 000 шагов это полезно

17.04.2024 Комментарии отключены

ГАЗЕТА

ПЕРАМОГА
ДЯТЛОВСКАЯ РАЙОННАЯ ГАЗЕТА
DIATLOVONEWS.BY

Все права принадлежат редакции газеты «Перамога». При использовании публикаций сайта, ссылка на источник и автора обязательна. Перепечатка материалов только с письменного разрешения редакции. Активная и индексируемая гиперссылка на источник материала обязательна.

СТАТИСТИКА САЙТА



ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР

Комарова Ирина Чеславовна
+375-1563-3-29-60

E-MAIL

drgp21@mail.ru, drgp@diatlovonews.by

ПРИЕМ РЕКЛАМЫ

Лещун Марина Антоновна
+375-1563-3-29-62

© 2018 Дятлово | «Перамога» | Все права защищены